Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «Па вёсках нашага краю»**

# Малая радзіма вялікіх людзей

***Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 460-годдзя з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в. Мацы Кобрынскага раёна***

Кобрын
2023

УДК 016:911.373-908(476.7)
ББК 91.9:26.89(4Беи)
М18

Серыя заснавана ў 2007 годзе

***Складальнік***
бібліёграф І катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі С. Д. Курачук

М18 **Малая радзіма вялікіх людзей** : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 460-годдзя з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в. Мацы Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2023. – 45 с. : іл. – (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

Выданне прысвечана юбілейнай даце - 460-годдзю з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах вёскі Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Прымеркаваны да Года міру і стварэння, інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік закліканы абудзіць пачуццё дачынення да гісторыі і сённяшняга дня сваёй малой радзімы, накіраваны на ўслаўленне малой радзімы праз папулярызацыю імёнаў славутых землякоў Кобрыншчыны як асновы патрыятычнага выхавання грамадзян. Выданне прызначана шырокаму колу карыстальнікаў.

**УДК 016:911.373-908(476.7)**
**ББК 91.9:26.89(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2023

# ЗМЕСТ


**ПРАДМОВА** 4

**АД МІНУЛАГА ДА СУЧАСНАСЦІ** 5
Гістарычны агляд 5
Паходжанне вёскі Мацы 8
Старадаўняя сядзіба роду Дзедзічаў 9
Партрэт вёскі ў рамках часу: дэмаграфія ў лічбах 10

**З МАЛЕНЬКАЙ ВЁСКІ – У ВЯЛІКАЕ ЖЫЦЦЁ**: вядомыя імёны 12
Антанюк Георгій Аляксандравіч 12
Антанюк Максім Антонавіч 14
Леванюк Аляксандр Сцяпанавіч 15
Леванюк Яўгеній Яўгеньевіч 16
Макарук Міхаіл Арсенцьевіч 17
Макарук Міхаіл Маркавіч 18
Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч 19
Пісарук Фёдар Фёдаравіч 21
Прымачук Васілій Іванавіч 22
Прымачук Віктар Іванавіч 23
Прымачук Іван Платонавіч 24
Прымачук Леанід Платонавіч 25
Раманюк Алена Фамінічна 26

**ЗЯМЛЯ, ЯКАЯ НАРАДЖАЕ ТАЛЕНТЫ**: фотарэпартаж 27

**СПІС КРЫНІЦ** 33

# ПРАДМОВА

«Малая радзіма вялікіх людзей» – чарговае выданне з серыі інфармацыйна-бібліяграфічных паказальнікаў пад агульнай назвай «Па вёсках нашага краю».

Інфармацыйна-аналітычны нарыс «Хидры – первый агрогородок на Кобринщине» прысвечаны вёсцы з найбольш развітай сацыяльнай і вытворчай інфраструктурай у Кобрынскім раёне, якая невыпадкова атрымала статус першага аграгарадка на Кобрыншчыне. Да 450-годдзя першага ўпамінання шматлікіх вёсак Кобрыншчыны на старонках гісторыі, першакрыніцай якіх з'явілася «Рэвізія Кобрынскай эканоміі, складзеная ў 1563 годзе каралеўскім рэвізорам Дзмітрыем Сапегам», выдадзены рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс «Сузор'е кобрынскіх вёсак». Інфармацыйна-пазнавальны даведнік «Скрозь памяць стагоддзяў» прысвечаны прыгожай даце – 500-гадоваму юбілею вёсак з самабытнымі народнымі традыцыямі – Балоты і Стрыгава. Гісторыка-краязнаўчы нарыс «Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні» выдадзены да 550-годдзя з часу першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах вёскі Дзівін, адной з самых вялікіх у Кобрынскім раёне. Нарыс «Летапіс роднай старонкі», які быў падрыхтаваны ў Год малой радзімы ў Рэспубліцы Беларусь, прысвечаны вёсцы з 500-гадовай гісторыяй Імянін. Да 475-годдзя з часу першага пісьмовага ўпамінання ўнікальных вёсак Кобрынскага раёна Лелікава і Павіцце выдадзены інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік «Малой радзімы прыцяжэнне». Выданне «Гарадзец – маленькі горад» прысвечана 880-годдзю з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах адной са старэйшых вёсак Кобрынскага раёна, якая мела гонар атрымаць у сярэднявеччы Магдэбургскае права.

Чарговае выданне серыі прымеркавана да 460-годдзя вёскі Мацы Кобрынскага раёна. Гісторыя яе пачалася яшчэ ў XVI стагоддзі, а першае згадванне адносіцца да 1563 года, калі вёска ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага. Але ў гісторыю яна ўвайшла зусім не па свайму гістарычнаму ўзросту. Вёска знамянальная тым, што дала свету шмат цікавых, адораных, таленавітых людзей, якія дасягнулі значных вышынь у розных галінах чалавечай дзейнасці. І ўсе яны сваёй працай, талентам праславілі родны край, сваю малую радзіму.

Выданне змяшчае інфармацыю пра вёску, расказвае аб падзеях далёкага мінулага і сучаснасці; вядомых земляках, якія праславілі сваю малую радзіму. Удакладняюць інфармацыю фотаздымкі з архіва Стрыгаўскай публічнай бібліятэкі, з асабістага фотаархіва Н. В. Якубец, фотагалерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. Шырока прадстаўлена бібліяграфія.

Прымеркаваны да Года міру і стварэння, інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік «Малая радзіма вялікіх людзей» заклiканы абудзіць пачуццё дачынення да гісторыі і сённяшняга дня сваёй малой радзімы, накіраваны на ўслаўленне малой радзімы праз папулярызацыю імёнаў славутых землякоў Кобрыншчыны як асновы патрыятычнага выхавання грамадзян.

Выданне прызначана шырокаму колу карыстальнікаў.

# АД МІНУЛАГА ДА СУЧАСНАСЦІ




## *ГІСТАРЫЧНЫ АГЛЯД*

МАЦЫ — вёска ў Тэвельскім сельскім савеце, на паўноўчна-заходнім беразе ракі Шэўня (прыток Мухаўца). За 14 км на ПнЗ ад горада і чыгуначнай станцыі Кобрын, 64 км ад Брэста. Каля аўтадарогі Кобрын — Камянец.

За багатую, амаль пяцівекавую гісторыю свайго існавання, гэты населены пункт бачыў многае — уладаранне польскіх, рускіх князёў, непасільную сялянскую працу, нашэсце чужаземных захопнікаў і размеранае жыццё вяскоўцаў у мірны час.

У *1563* годзе гэта вёска Асавая Глінянскага войтаўства Кобрынскай эканоміі Вялікага княства Літоўскага; 12 валок зямлі, 11 двароў.

У *1742* годзе ў Вежацкім ключы Брэсцкай эканоміі, 12 валок зямлі. У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) вёска ў складзе Расійскай імперыі, у Пружанскім павеце.

З *1801* года вёска знаходзілася ў Гродзенскай губерні. У гэты час у вёсцы налічвалася 62 дамы. У жніўні *1812* года ў гэтых мясцінах прайшоў бой паміж рускім егерскім палком і аўстра-саксонскай кавалерыяй. Жыхары вёскі Мацы ўдзельнічалі ў пабудове мураванай Успенскай царквы ў Тэўлях, якая была асвечана ў 1872 годзе. У *1890* годзе вёска ў Мураўёўскай воласці; 342 дзесяціны зямлі; пры вёсцы ў уладальніка П. Кузьмуна мелася 14 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся аднайменны маёнтак, уладанне А. Малахоўскага, 414,5 дзесяціны зямлі (разам з фальваркам Глінянка і ўрочышчам Цямніца). У *1897* годзе

ў вёсцы 52 двары, 339 жыхароў, 2 хлебазапасныя магазіны; у маёнтку — 12 двароў, 60 жыхароў.

У *1905* годзе вёска, 420 жыхароў, і маёнтак, 8 жыхароў. У жніўні *1915 года* паблізу праходзілі баі рускай арміі з нямецкімі захопнікамі, загінулі 200 рускіх воінаў, пахаваны на Тэвельскіх могілках. У ліпені *1920* года ў гэтых месцах адбыліся баі з польскімі інтэрвентамі, загінулі 50 чырвонаармейцаў. З *1921* года вёска ў складзе Польшчы, у Мацясаўскай гміне Пружанскага павета Палескага ваяводства, 36 двароў, 181 жыхар. У *1930-я* гады працавала школа.

З восені *1939* года Мацы сярод вызваленых раёнаў Заходняй Беларусі, якія далучыліся да БССР. З *15 студзеня 1940* года ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з *12 кастрычніка 1940* года ў Стрыгаўскім сельсавеце. У *1940* годзе вёска налічвала 67 двароў, 359 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну, *з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944* года, вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Блізкае размяшчэнне чыгункі Брэст - Масква (за 3 км ад вёскі) у гады вайны прыцягвала сюды і партызан, і немцаў. І нягледзячы на тое, што Мацы ацалелі, без ахвяр абысціся не ўдалося, ды і жыццё ў мястэчку ў той час было цяжкае. Вызвалена вёска воінамі 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі 28-й арміі 1-га Беларускага фронту. На франтах ваявалі многія мужчыны з вёскі, не ўсе з іх вярнуліся. Іх імёны знаходзяцца на помніку землякам у аграгарадку Стрыгава.

У пасляваенны перыяд мірнае жыццё паступова наладжвалася. На гэты час у Мацах было каля 70 дамоў. Усе яны размяшчаліся на адзінай вуліцы, што існуе і цяпер. З-за малой колькасці зямлі сынам, што абзаводзіліся сем’ямі, даводзілася будаваць жыллё побач з бацькоўскім. Нярэдка атрымлівалася, што паміж пабудовамі быў толькі вузкі праход. Такую «планіроўку» вёскі і цяпер можна разглядзець па шэрагу прыкмет, што засталіся паміж цяпер ужо рэдка размешчанымі дамамі.

*24 лютага 1949* года ў Мацах быў створаны калгас імя Конева, які праіснаваў да *14 сакавіка 1950* года.

З *11 жніўня 1959* года в. Мацы ў Тэвельскім сельсавеце. Паводле перапісу *1959* года ў вёсцы было 263 жыхары, у *1970* годзе — 171 жыхар.

У *1999* годзе ў в. Мацы 49 гаспадарак, 101 жыхар. Вёска ў складзе калгаса імя Дзімітрава (з *2004* года ААТ «Стрыгава»; цэнтр — в. Стрыгава). У *2005* годзе – 44 гаспадаркі, 90 жыхароў.



Сёння, на жаль, старых домікаў становіцца ўсё менш. Вёска ўжо не тая, якой была. Прыехалі новыя людзі, пасяліліся ў калгасных дамах. Асноўнае насельніцтва складаюць украінцы, якія, як спадзяюцца старажылы вёскі, будуць працягваць слаўныя традыцыі мястэчка, перадаючы цягу да вучобы будучым пакаленням. Магчыма, і сярод гэтых хлопчыкаў і дзяўчынак знойдуцца такія, што таксама праслаўяць малую радзіму нейкімі навуковымі дасягненнямі ці проста стараннай працай. І ў дарослым жыцці таксама, як нашы героі, будуць успамінаць малую радзіму са шчымлівым пачуццём і пры магчымасці прыязджаць сюды хоць на некалькі дзён.

Паводле перапісу *2019* года ў вёсцы Мацы пражываюць 75 жыхароў, з іх маладзей працаздольнага ўзросту – 9, працаздольнага ўзросту – 52, старэйшых за працаздольны ўзрост – 14.








## *ПАХОДЖАННЕ НАЗВЫ ВЁСКІ*




На зямлі Беларусі зараз бадай што не знойдзецца ніводнай геаграфічнай назвы, якая б узнікла выпадкова. Кожны населены пункт, кожнае мясцечка звычайна маюць сваю назву, сваё, часам непаўторнае, моўнае абазначэнне. Тапанімічнае імя заўсёды мае канкрэтны сэнс. У ім па большай частцы выяўляюцца ці якія-небудзь прыкметы ўрочышча, ці намёк на паходжанне, ці характэрная рыса мясцовасці, ці якая-небудзь акалічнасць…

Наконт паходжання вёскі Мацы існуе некалькі версій. Адна з іх: «Мацы» ці «Струга» – пратокі ў балоце. Азначае месца побач з пратокай.




Другая версія сцвярджае, што, магчыма, назва ўтворана ад літоўскай асновы, што азначае «малы». *«Мацы – с. Кобринского р-на. Название, производимое от литовской основы mackas – малый. Такие же названия неоднократно встречаются в Литве» (Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. Минск, 1974. С. 226.)*




Існуе версія, што Мац – вуснамоўны ўсечаны варыянт царкоўнага праваслаўнага імя Матфей, каталіцкага Мацей. У старабеларускіх помніках пачатку XVI стагоддзя засведчана ў якасці асабовага імя Мац, Мартин. У тапанімію, магчыма, трапіла праз стадыю прозвішча Мац (*Лемцюгова, В. П. Тапонімы распавядаюць. Мінск, 2008. С. 244*).

Ёсць яшчэ меркаванне, што назва магла адбыцца і ад яўрэйскага слова «маца», што азначае рытуальную ежу.

Прыкладна ў 60-я гады XX стагоддзя вырашана было перайменаваць вёску. І «Малінаўка», і «Дуброўка» прапаноўваліся ў якасці новай назвы, але толькі не прыжыліся гэтыя назвы. І правільна, лічаць жыхары, бо невыпадкова калісьці гэтаму мястэчку далі такое «моцнае» імя – Мацы.

# *СТАРАДАЎНЯЯ СЯДЗІБА РОДУ ДЗЕДЗІЧАЎ*

Старадаўняя сядзіба роду Дзедзічаў размяшчалася побач з вёскай Мацы.



Да Другой сусветнай вайны ў склад сядзібна-паркавага ансамбля ўваходзілі сядзібны дом, пейзажны парк і шэраг гаспадарчых пабудоў.

Сядзібны дом быў пабудаваны, верагодна, да Першай сусветнай вайны з дрэва, меў мураваны склеп. У пасляваенны час дом разбураны, на яго месцы пабудаваны прыватны дом мясцовых жыхароў. Склеп захаваўся да сённяшняга часу практычна ў першародным выглядзе.



Парк занядбаны, яго рэшткі займаюць каля 2,5 га, у цэнтры – вялікая сажалка. Раней у парку існаваў каскад сажалак. Самая вялікая з сажалак мела пасярэдзіне выспу, на якой размяшчалася альтанка для адпачынку. Да альтанкі вяла сцежка праз масток.

У пасляваенны час пасля стварэння ў парку пляцоўкі для нарыхтоўкі торфу форма сажалак моцна змянілася.

Рэшткі парку з сажалкамі патрабуюць узяцця на ўлік і пад ахову дзяржавы.





*Рэшткі парку з сажалкамі*

# *ПАРТРЭТ ВЁСКІ Ў РАМКАХ ЧАСУ:*
## дэмаграфія ў лічбах



***XIX стагоддзе***

*1897 год* — 339 чал.

***XX стагоддзе***

*1905 год* — 420 чал.;
*1921 год* — 181 чал.;
*1940 год* — 359 чал.;
***1959 год* — 263 чал.** (перапіс)
*1970 год* — 171 чал.;
*1983 год* — 116 чал.;
*1984 год* — 115 чал.;
*1985 год* — 100 чал.;
*1986 год* — 113 чал.;
*1987 год* — 113 чал.;
*1988 год* — 108 чал.;
***1989 год* — 104 чал**. (перапіс);
*1994 год* — 95 чал.;
*1995 год* — 96 чал.;
*1996 год* — 95 чал.;
*1997 год* — 88 чал.;
*1998 год* — 92 чал;
***1999 год* — 101 чал.** (перапіс)
*2000 год* — 99 чал.

***XXI стагоддзе***

*2001 год* — 96 чал.;
*2002 год* — 105 чал.;

*2003 год* — 103 чал.;
*2004 год* — 107 чал.;
*2005 год* — 90 чал;
*2006 год* — 92 чал.;
*2007 год* — 90 чал.;
2008 *год* — 84 чал.;
***2009 год* — 84 чал.** (перапіс)
*2010 год* — 80 чал.;
*2011 год* — 80 чал.;
*2012* год — 81 чал.;
*2013* год — 81 чал.;
*2014* год — 75 чал.;
*2015* год — 81 чал.;
*2016 год* — 84 чал.;
*2017 год* -– 91 чал.;
*2018 год* — 86 чал.;

***2019 год* — 75 чал., з іх маладзей працаздольнага ўзросту – 9, працаздольнага ўзросту – 52, старэйшых за працаздольны ўзрост – 14** (перапіс)

*2020 год* — 75 чал.;
*2021 год* — 74 чал.;
*2022 год — 74 чал.;*
*2023 год — 75 чал.*

**Дынаміка колькасці насельніцтва**
**в. Мацы Кобрынскі раён**



# З МАЛЕНЬКАЙ ВЁСКІ – У ВЯЛІКАЕ ЖЫЦЦЁ

## *Вядомыя імёны*

Гонар і славу складаюць імёны многіх нашых землякоў як на Беларусі, так і далёка за яе межамі. Невялікая вёсачка Мацы, якая сёння з колькасцю да 100 жыхароў, падарыла свету цэлы букет таленавітых людзей, вялікую колькасць прафесіяналаў у самых розных сферах дзейнасці.

Наогул, вёска Мацы незвычайная. У пасляваенны час сярод яе карэнных жыхароў (сем'і Грышчукоў, Карпукоў, Леванюкоў, Макарукоў, Пісарукоў, Прымачукоў) існаваў няпісаны закон: дзеці павінны абавязкова атрымаць вышэйшую адукацыю. Прэстыжнасць вучобы была вялікай, бацькі накіроўвалі сваіх дзяцей на вучобу, заахвочвалі іх імкненне да ведаў. Каля 30 чалавек у пасляваенны час рынуліся ў сталіцу грызці граніт навукі. І вельмі паспяхова. У свой час шасцёра з сям'і Прымачукоў закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы. У шматдзетнай сям'і Арсенія Грышчука з васьмі дзяцей шасцёра атрымалі вышэйшую адукацыю. Яны, паступаючы ў самыя розныя ўніверсітэты Савецкага Саюза, увекавечылі імя вёскі ў летапісах гісторыі.

Безумоўна, зямля, якая дала свету такую колькасць таленавітых людзей, благаслаўлёная, шчодрая зямля!

## АНТАНЮК ГЕОРГІЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ

**беларускі філосаф, сацыёлаг, даследчык прадметнай логікі, метадолаг сістэмнага падыходу ў сацыялогіі, адзін з першых распрацоўшчыкаў метадалогіі сістэмнага падыходу ў сацыялагічным даследаванні**



Георгій Аляксандравіч Антанюк нарадзіўся 13 лістапада 1942 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Бацька, Аляксандр Барысавіч Антанюк (1911–2003), быў кавалём; маці, Надзея Данілаўна (у дзявоцтве Яфімук; 1924–1996), працавала паляводам. Дзяцінства Георгія прыпала на нямецка-фашысцкую акупацыю, пасляваенную нястачу.

У 1949–1953 гадах Георгій вучыўся ў пачатковай школе ў вёсцы Мацы, у 1953–1959 гадах – у сярэдняй школе ў вёсцы Стрыгава, скончыў 10 класаў. Пасля заканчэння школы паступіў у Магілёўскі машынабудаўнічы тэхнікум, атрымаў спецыяльнасць «тэхнік-тэхнолаг зварачнай вытворчасці». Праходзіў тэрміновую службу ў Савецкай арміі (1962–1965).

У 1965 годзе Георгій Антанюк паступіў на дзённае аддзяленне філасофскага факультэта Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «філосаф», які скончыў у 1970 годзе. Вучыўся ў аспірантуры Інстытута філасофіі і права АН БССР (1970–1973). З 1973 года працаваў спачатку малодшым, потым старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права АН БССР (цяпер Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі), прымаў удзел у правядзенні прыкладных сацыялагічных даследаванняў.

У 1974 годзе Г. А. Антанюк абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Системный подход в социологическом исследовании (методологические проблемы исследования взаимоотношения социальной системы и её компонентов), атрымаў ступень кандыдата філасофскіх навук.

З 1980 года па чэрвень 2004 года – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар на кафедры філасофіі АН БССР (з 1991 года – НАН Беларусі, з 1998 года – у складзе Інстытута філасофіі НАН Беларусі, з 2002 года – Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі).

У 1990 годзе Г. А. Антанюк абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Социальное проектирование (теоретико-методологический аспект)». Доктарская дысертацыя прысвечана тэорыі і метадалогіі праектавання сацыяльных адносін у кіраванні грамадствам. Доктар філасофскіх навук (1991), прафесар (1993).

Г. А. Антанюком апублікавана звыш 70 навуковых работ на папяровых носьбітах і звыш 100 навуковых прац выкладзены для ўсеагульнага доступу ў Інтэрнэце. Аўтар прац па праблемах сацыяльнага кіравання, сацыяльнага праектавання і міжэтнічных адносін: «Социальное проектирование и управление общественным развитием: Теоретико-методологический аспект» (1986), «Социальное проектирование в процессе практического применения социальных знаний» (1992), «Объективная цель человечества и его стандартизация» (2003) і інш. Адзін з аўтараў кнігі «Сацыяльна-філасофскія праблемы вытворчасці і выкарыстання навуковых ведаў» (1992).

Прафесар Антанюк – наватар у распрацоўцы метадалогіі сацыяльна-інжынернага праектавання, прысвяціў гэтай тэме шэраг грунтоўных работ. Ён лічыцца адным з вядомых футуролагаў, даследчыкаў прадметнай логікі, сацыяльных інжынераў-метадолагаў сацыяльнай інжынерыі і сістэмных падыходаў у сацыялогіі. З 1990-х гадоў Георгій Аляксандравіч паступова пераходзіць да крытычнага пераасэнсавання філасофіі і ў цэлым ідэалогіі як крыніцы аб’ектыўнага пазнання. Даследуе агульнасацыяльныя і агульнафіласофскія праблемы, вывучае праблемы сістэмнага падыходу ў сацыялагічным даследаванні, метадалогіі навуковага пазнання, а таксама маралі, палітыкі, ідэалогіі і дзяржаўнага будаўніцтва, рэлігіі, нацыянальна-этнічных адносін і інш. З 1992 года рэгулярна публікуецца ў СМІ па розных актуальных праблемах Беларусі і Расіі і праблемах, якія існуюць ва ўзаемаадносінах паміж краінамі.

Не забывае ніколі Георгій Антанюк пра сваю малую радзіму. Пра гэта яскрава сведчыць і адзін з яго артыкулаў у газеце «Збудінне» — «Заходнія палешукі: іх шлях да сусветнай гісторыі (кароткая гістарычная даведка)».

# АНТАНЮК МАКСІМ АНТОНАВІЧ
## савецкі ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, Першай сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў



Максім Антонавіч Антанюк нарадзіўся 19 кастрычніка 1895 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і.

З 1912 года працаваў на караблях гандлёвага флоту Рыжскага таварыства параходства: юнга, матрос, качагар.

У чэрвені 1915 года Максім Антанюк мабілізаваны на ваенную службу. У красавіку 1916 года закончыў III Маскоўскую школу прапаршчыкаў і прызначаны малодшым афіцэрам у запасны батальён у Нарве. У кастрычніку 1916 года накіраваны ў дзеючую армію. Ваяваў на Паўночным фронце ў складзе 56-га Сібірскага стралковага палка 3-й Сібірскай стралковай дывізіі. У тым жа годзе закончыў курсы пры 6-м Сібірскім сапёрным батальёне і пераведзены ў 72-гі Сібірскі стралковы полк: малодшы афіцэр разведкі і сувязі палка, ваяваў пад Рыгай; у канцы 1916 года – падпаручнік.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года Максім Антанюк арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасць, бальшавіцкую агітацыю, аднак быў вызвалены працоўнымі атрадамі і выехаў у Петраград. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года ў Петраградзе. З кастрычніка 1917 года ў Чырвонай гвардыі, камандзір 2-га Кранштацкага атрада, удзельнік баёў супраць генерала Краснова пад Царскім Сялом.

У Грамадзянскую вайну 1918–1920 гадоў – памочнік камандзіра палка, камандзір батальёна Паўднёвай групы войскаў 5-й арміі, 10-й Камышынскай і іншых дывізій. Пасля грамадзянскай вайны камандзір 5-й Віцебскай, 3-й Крымскай стралковых дывізій, намеснік генерал-інспектара пяхоты Чырвонай арміі.

У кастрычніку 1920 года М. А. Антанюк накіраваны на вучобу ў Акадэмію Генштаба Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. У чэрвені 1921 года камандзіраваны на Туркестанскі фронт, дзе камандаваў 136-й асобнай пагранічнай брыгадай Усерасійскай надзвычайнай камісіі. Па вяртанні з кастрычніка 1921 года працягнуў вучобу ў Акадэміі.

Па завяршэнні вучобы ў жніўні 1924 года М. А. Антанюк прызначаны камандзірам 4-й Туркестанскай стралковай дывізіі, адначасова з'яўляўся начальнікам войскаў Сярэдняй і Заходняй Бухары. З лістапада 1925 года –

камандзір 5-й Віцебскай стралковай дывізіі імя чэхаславацкага пралетарыята, з кастрычніка 1927 года – камандзір і ваенкам 3-й Крымскай стралковай дывізіі.

Член ЦВК Узбекістана ў 1925 годзе, ЦВК БССР у 1927 годзе. Закончыў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе ў 1927 годзе. З кастрычніка 1930 года – выкладчык Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзе. 4 чэрвеня 1940 года М. А. Антанюку прысвоена званне генерал-лейтэнанта, ён быў прызначаны начальнікам пяхоты Чырвонай арміі.

У Вялікую Айчынную вайну М. А. Антанюк – камандуючы 2-й, 3-й рэзервовымі і 48-й арміямі, групамі войск Ленінградскага фронту, на іншых камандных пасадах. У чэрвені 1944 года залічаны ў групу афіцэраў пры Маршале Савецкага Саюза Г. К. Жукаве. З лютага 1945 года да канца вайны знаходзіўся ў распараджэнні Ваеннага савета 1-га Беларускага фронту. Пасля вайны – намеснік камандуючага войскамі Львоўскай ваеннай акругі. 31 студзеня 1947 года звольнены ў запас па хваробе.

Узнагароджаны ордэнам Леніна (1945), трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга (1922, 1938, 1944), ордэнамі Суворава II ступені (1945), Айчыннай вайны I ступені (1943), медалямі, польскім Грунвальдскім крыжом II ступені.

М. А. Антанюк памёр 30 ліпеня 1961 года, пахаваны на Новадзевічых могілках г. Масквы.

## ЛЕВАНЮК АЛЯКСАНДР СЦЯПАНАВІЧ
### музыкант, былы дырэктар Жабінкаўскай музычнай школы, кіраўнік духавога аркестра



Нарадзіўся Аляксандр Леванюк у вёсцы Мацы 26 лютага 1941 года, амаль за чатыры месяцы да вайны. Вучыўся ў Стрыгаўскай сярэдняй школе.

Пасля заканчэння дзесяцігодкі падаўся ў Кобрынскі прамкамбінат рабочым. Першы заробак патраціў на баян, бо душа патрабавала музыкі. Іграў на мандаліне.

Валодаць народнымі інструментамі вясковых хлапчукоў навучыў мясцовы майстар і музыкант дзядзька Васіль. Дзякуючы яму ў вёсцы быў створаны ансамбль народных інструментаў, які карыстаўся вялікай папулярнасцю на школьных урачыстасцях.

Нотную грамату Аляксандр асвойваў з дапамогай самавучыцеля, таму ў 1959 годзе лёгка паступіў на духавое аддзяленне Брэсцкага музычнага вучылішча (цяпер – Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы). Завочна скончыў Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна (цяпер – Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна).

У працоўнай кніжцы Аляксандра Сцяпанавіча ўсяго некалькі запісаў: вучоба, служба ў войску, праца ў Пружанскай музычнай школе, педагог Жабінкаўскай музычнай школы, дырэктар Жабінкаўскай музычнай школы.

У верасні 1981 года А. С. Леванюк стаў дырэктарам Жабінкаўскай музычнай школы. Працаваў на гэтай пасадзе 22 гады. Паступова палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы, набываліся новыя музычныя інструменты, павялічыўся кантынгент вучняў і выкладчыкаў, былі створаны аркестровыя дзіцячыя калектывы, узрасла колькасць выпускнікоў школы, якія паступалі ў музычныя вучылішчы. У гэты перыяд у школе працуюць дзіцячыя творчыя калектывы: цымбальны, народных інструментаў і духавы аркестры, хор і фальклорны вакальны ансамбль. З педагогаў былі створаны аркестр народных інструментаў і ансамбль народнай музыкі. Аляксандр Сцяпанавіч кіраваў у горадзе духавым аркестрам, які неаднаразова ўдзельнічаў у абласных фестывалях духавой музыкі, аглядах-конкурсах. З 2004 года па 2015 год, амаль да апошніх дзён свайго жыцця, працаваў настаўнікам па класе кларнета і саксафона.

У вёсцы Мацы ў яго быў дачны домік, побач з якім пасаджаны малады садок. «*У вёсцы была завядзёнка абавязкова пасадзіць сад, інакш ты – не гаспадар*», - успамінаў Аляксандр Сцяпанавіч, які ніколі не забываў і часта наведваў сваю малую радзіму.

Памёр Аляксандр Сцяпанавіч Леванюк 25 жніўня 2015 года.

## ЛЕВАНЮК ЯЎГЕНІЙ ЯЎГЕНЬЕВІЧ
### праграміст, спецыяліст у галіне праграмнага забеспячэння, рацыяналізатар



Яўгеній Яўгеньевіч Леванюк нарадзіўся 3 студзеня 1944 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна. Тут прайшло яго дзяцінства. Вучыўся спачатку ў пачатковай школе ў Мацах, потым у Стрыгаўскай сярэдняй школе. Яўгеній шмат чытаў, актыўна наведваў Стрыгаўскую бібліятэку. Займаўся такім інтэлектуальным відам спорту, як шашкі.

У 1960 годзе скончыў школу і ў наступным годзе паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Пасля заканчэння ўніверсітэта застаўся ў Мінску. Працаваў у буйной навуковай установе ў сістэме Акадэміі навук БССР – Беларускім навукова-даследчым геолагаразведачным інстытуце (БНДГІ), Цэнтральным навукова-даследчым і праектна-тэхналагічным інстытуце арганізацыі і тэхнікі кіравання, ААТ «Элема». Займаўся распрацоўкай і ўкараненнем праграмнага забеспячэння.

За час працоўнай дзейнасці, а гэта каля 45 гадоў, Яўгеній Яўгеньевіч унёс шмат канструктыўных, рацыяналізатарскіх прапаноў. З'яўляецца аўтарам шэрагу артыкулаў, у тым ліку ў суаўтарстве.

Праз усё сваё жыццё Я. Я. Леванюк пранёс не проста захапленне шашкамі, але і жаданне ўдасканальвацца, іграць лепш і мацней. Для яго шашкі – гэта адначасова захапленне і спорт. Яўгеній Яўгеньевіч з'яўляецца майстрам спорту па шашках, удзельнікам чэмпіянатаў Рэспублікі Беларусь.

Сёння Яўгеній Яўгеньевіч Леванюк на пенсіі. Ён вельмі ганарыцца сваімі дочкамі. Абедзве з чырвонымі дыпломамі скончылі БДУ (прыкладная матэматыка).

## МАКАРУК МІХАІЛ АРСЕНЦЬЕВІЧ
## вучоны ў галіне ветэрынарыі, педагог, дацэнт



Міхаіл Арсенцьевіч Макарук нарадзіўся 1 студзеня 1947 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Вучыўся ў пачатковай школе ў Мацах, затым у Стрыгаўскай сярэдняй школе.

У 1969 годзе з адзнакай закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут.

Працаваў галоўным ветэрынарным урачом саўгаса «Жабінкаўскі» Брэсцкай вобласці.

З 1973 па 1975 год Міхаіл Арсенцьевіч – аспірант кафедры ўнутраных незаразных хвароб Віцебскага ветэрынарнага інстытута медыцыны, з 1976 года – асістэнт кафедры. Кандыдацкую дысертацыю «Особенности субклинических нарушений обмена веществ у коров, иммунобиологическая резистентность, состав молозива и заболеваемость телят в неонатальный период» абараніў у 1976 годзе.

З 1982 года М. А. Макарук – дацэнт кафедры фізіялогіі. З верасня па чэрвень 1982 года знаходзіўся на стажыроўцы ў Маскоўскай ветэрынарнай акадэміі з мэтай вывучэння французскай мовы, пасля чаго быў накіраваны на выкладчыцкую працу ў Гвінейскую Народную Рэвалюцыйную Рэспубліку (з 1984 года Гвінейская Рэспубліка), дзе знаходзіўся да кастрычніка 1986 года.

У 1989–1992 гадах – намеснік дэкана факультэта завочнага навучання Віцебскага ветэрынарнага інстытута. У 1992–1996 гадах – дацэнт кафедры нармальнай і паталагічнай фізіялогіі Віцебскага ветэрынарнага інстытута (з 1994 года - Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны). З 1996 па 1999 год – намеснік дэкана факультэта ветэрынарнай медыцыны ВДАВМ.

М. А. Макарук з’яўляецца аўтарам шэрагу артыкулаў па паталагічнай фізіялогіі жывёл, уключаных у «Ветеринарную энциклопедию» (1994, 2013), тыпавой праграмы па паталагічнай фізіялогіі для вышэйшых сельскагаспадарчых навучальных устаноў (2001, 2008), навучальнага дапаможніка «Типовые патологические процессы» (2011; у суаўтарстве). Апублікаваў 76 навуковых і метадычных прац, сярод якіх навучальна-метадычныя дапаможнікі: «Патологические изменения в тканях», «Биологические аспекты опухолей», «Положение об инфекционном процессе», «Лейкограмма и ее диагностическое значение» і інш. Пад кіраўніцтвам Міхаіла Арсенцьевіча выкананы магістарская дысертацыя і шэраг дыпломных работ.

## МАКАРУК МІХАІЛ МАРКАВІЧ
## кандыдат ваенных навук, генерал-маёр авіяцыі, ваенны лётчык-інструктар I класа



Міхаіл Маркавіч Макарук нарадзіўся 1 жніўня 1945 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння Стрыгаўскай сярэдняй школы вырашыў паступаць у Чарнігаўскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча, але не прайшоў па конкурсе. Працаваў старшым піянерважатым у Рынкаўскай сярэдняй школе Кобрынскага раёна. Юнак валодаў добрымі арганізатарскімі здольнасцямі, захапляўся мадэліраваннем, разьбой па дрэве, любіў спорт.

У 1963–1967 гадах Міхаіл Макарук – курсант Чарнігаўскага вышэйшага ваеннага авіяцыйнага вучылішча. З 1967 года па 1973 год – лётчык-інструктар, намеснік камандзіра авіяцыйнай эскадрыллі вучэбнага палка Чарнігаўскага вучылішча. У 1973–1976 гадах – слухач Ваенна-паветранай акадэміі імя Ю. А. Гагарына.

З 1976 года М. М. Макарук – камандзір авіяцыйнай эскадрыллі, намеснік камандзіра авіяцыйнага палка, інспектар упраўлення ваенна-вучэбных устаноў ВПС СССР. З 1978 года Міхаіл Маркавіч, які добра валодае іспанскай і англійскай мовамі, знаходзіўся на ваенна-дыпламатычнай рабоце. У 1978–1989 гадах ён памочнік ваеннага аташэ пры пасольствах СССР у Рэспубліцы Куба, Рэспубліцы Індыя, у 1989–1991 гадах – ваенны, ваенна-марскі і ваенна-паветраны аташэ пры пасольстве СССР у Федэрацыі Малайзія. З 1991 года М. М. Макарук – памочнік галоўнакамандуючага ВПС, намеснік начальніка ўпраўлення ВПС Галоўнага аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай

Федэрацыі. У 1997–2000 гадах – ваенны, ваенна-паветраны і ваенна-марскі аташэ пры пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Іспаніі, з 2001 года – у Рэспубліцы Куба.

1 жніўня 2005 года Міхаіл Маркавіч сышоў у запас у сувязі з пенсійным узростам. Актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю. Член прэзідыума Агульнарасійскай арганізацыі «Офицеры России». Член Асацыяцыі ветэранаў Карыбскага крызісу. З 2018 года Міхаіл Маркавіч – першы віцэ-прэзідэнт Расійскага таварыства дружбы з Кубай. З'яўляецца кіраўніком Маскоўскага аддзялення Міжрэгіянальнай грамадскай арганізацыі «Содружество воинов-интернационалистов «кубинцев».

Пражываючы ў Маскве, высокапастаўлены дзеяч памятае, што яго малая радзіма – у Беларусі, на Брэстчыне. У Кобрынскім раёне пахаваны яго бацькі, дзяды і прадзеды. Тут жывуць яго родныя сёстры, блізкія сябры, землякі. Таму і імкнецца ён часцей бываць у родных краях. Падчас сваіх адпачынкаў Міхаіл Маркавіч заўсёды прыязджае ў родную вёску Мацы.

## МАЛАХОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ ЮЛЬЯНАВІЧ
## адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі, вынаходнік, інжынер, фотааматар



Уладзіслаў Юльянавіч Малахоўскі нарадзіўся ў 1827 годзе ў маёнтку Маце Стрыгаўскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (сёння ад маёнтка нічога не засталося, паблізу ёсць вёска Мацы Тэвельскага сельсавета Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Пасля хатняга навучання юнак набываў веды ў Свіслацкай гімназіі, якая адкрыла дарогу ў свет многім славутым людзям Беларусі. Закончыў Пецярбургскі інстытут інжынераў шляхоў зносін, быў накіраваны ў Вільню на будаўніцтва чыгункі.

У сталіцы Расійскай імперыі маладым чалавекам авалодалі ідэі барацьбы за пераўтварэнне грамадства. Уладзіслаў Малахоўскі наладзіў кантакты з тайнай рэвалюцыйнай арганізацыяй разначынцаў «Зямля і воля». У Пецярбургу пазнаёміўся з Кастусём Каліноўскім (1838–1864), які вучыўся на юрыдычным факультэце ўніверсітэта.

У 1863 годзе Уладзіслаў Малахоўскі стаў адным з кіраўнікоў партыі «чырвоных»: займаў пасаду начальніка паўстанцаў Вільні. Уваходзіў у склад Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы, потым Выканаўчага аддзела Літвы. Яго бескампрамісная пазіцыя паўплывала на прызначэнне начальнікам аддзела па вынясенні і выкананні прыгавораў. На яго плечы легла страшная, нечалавечая

адказнасць за вырашэнне лёсаў тых, каго паўстанцы лічылі найбольш вінаватымі перад народам.

Ахранка правяла шматлікія арышты, набліжалася да выкрыцця Уладзіслава Малахоўскага, і ён пакінуў Вільню. Са жніўня 1863 года знаходзіўся на нелегальным становішчы, выехаў у Пецярбург, потым у Кёнігсберг, дзе быў прадстаўніком К. Каліноўскага, удзельнічаў у выданні падпольнай газеты «Głos z Litwy», займаўся закупкай і дастаўкай зброі для паўстанцаў.

Пасля падаўлення паўстання У. Ю. Малахоўскі выехаў у Англію. З 1866 года жыў у Лондане пад прозвішчам Леон Варнерке. Ён пакінуў выношваць планы звяржэння самадзяржаўя, вырашыў заняцца інжынернай справай: распрацоўваць фатаграфічныя прылады. У англійскай сталіцы заснаваў уласную фірму, якая займалася фотасправай. Ужо праз пяць гадоў фірма «Варнерке і К» стала шырока вядомай ва ўсёй Заходняй Еўропе. У. Ю. Малахоўскі набыў шырокую вядомасць шэрагам вынаходак у галіне фотатэхнікі. У 1875 годзе сканструяваў фотаапарат са скручанай касетай, які спецыялісты лічаць прататыпам сучасных аматарскіх камераў «Кодак».

Важны ўклад унёс У. Ю. Малахоўскі ў сам працэс фатаграфавання: фотапласцінкі ён замяніў на плёнку, пакрытую бромсерабром. Плёнка з нанесеным на яе такім матэрыялам лёгка скручваецца ў рулон, таму на ёй можна было рабіць некалькі кадраў. Кошт такой камеры быў высокі, але пакупнікі знаходзіліся. Яго адкрыццё выклікала пераварот у сусветнай фотасправе. У. Ю. Малахоўскі пачаў ездзіць па розных краінах і прапагандаваць свае адкрыцці.

У 1880-я гады У. Ю. Малахоўскі некалькі разоў пабываў у Расіі, у т. л. у Маскве і Пецярбургу. Пад імем Льва Вікенцьевіча Варнерке ўдзельнічаў у фотавыстаўках, у заснаванні секцыі фатаграфіі Расійскага імператарскага тэхнічнага таварыства. У 1882 годзе на Усерасійскай выставе ў Маскве ўзнагароджаны сярэбраным медалём. Адкрыццямі нашага земляка захапляўся расійскі вучоны-хімік Дзмітрый Мендзялееў.

Фірма У. Ю. Малахоўскага імкліва развівалася. Сведчаннем гэтага служылі шматлікія філіялы не толькі ў Вялікабрытаніі, але і ў іншых еўрапейскіх краінах. Але, на жаль, дзейнасць фірмы была азмрочана абвінавачваннямі ў выкарыстанні фальшывых расійскіх рублёў адным з філіялаў лабараторыі ў 1898 годзе. У судзе віна У. Ю. Малахоўскага не была даказана, але беспадстаўныя абвінавачванні выклікалі ў яго цяжкія перажыванні. Нягледзячы на апраўдальны вердыкт суда, душэўнае супакаенне не прыйшло. 7 кастрычніка 1900 года Уладзіслаў Малахоўскі, не вытрымаўшы маральных пакут, скончыў жыццё самагубствам у Жэневе, там і быў пахаваны. А фальшывыя купюры пад назвай «варнеркі» і цяпер карыстаюцца попытам сярод калекцыянераў-баністаў.

Ідэямі У. Ю. Малахоўскага скарыстаўся амерыканскі бізнесмен Джордж Істмен (1854–1932), які першым выпусціў на рынак фотаапарат «Кодак» з касетамі са скручанай плёнкай. Цяпер фатографу не абавязкова было мець прафесійныя веды ў праяўленні матэрыялу і друку здымкаў, дастаткова было перадаць касету ў фоталабараторыю і атрымаць гатовыя здымкі.

…Невядома, ці з'явілася б фірма «Кодак», фотаапараты якой сёння карыстаюцца папулярнасцю ва ўсім свеце, калі б беларуская зямля не падарыла свету Уладзіслава Малахоўскага.

## ПІСАРУК ФЁДАР ФЁДАРАВІЧ
## заслужаны работнік культуры Беларускай ССР, палкоўнік



Фёдар Фёдаравіч Пісарук нарадзіўся 9 лістапада 1941 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Бацька загінуў на фронце ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вучыўся Фёдар у Стрыгаўскай сярэдняй школе, якую скончыў у 1960 годзе.

Пасля заканчэння школы пайшоў у армію. Курсант навучальнага падраздзялення (1960–1962, Беларуская ваенная акруга БВА).

У 1962 годзе паступіў у Львоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча, якое было адзіным у сваім родзе ў Савецкім Саюзе — рыхтавала ваенных журналістаў і спецыялістаў па клубнай рабоце ў арміі. Менавіта з культурай Фёдар Фёдаравіч звязаў сваё жыццё.

У 1966 годзе скончыў вучылішча, накіраваны ў Слуцк, у Дом афіцэраў. Начальнік клуба зенітна-ракетнага, танкавага, мотастралковага палкоў 5-й ТА (1966–1969, БВА), інструктар па культурна-масавай рабоце палітычнага аддзела дывізіі (1969–1971, БВА).

З 1971 года па 1983 год служыў у Групе савецкіх войскаў у Германіі, кантынгенце Узброеных Сіл СССР на тэрыторыі ГДР, – старшы інструктар аддзела прапаганды і агітацыі палітупраўленняў акругі, групы войскаў.

Пайшоў у адстаўку ў званні палкоўніка і пераехаў у Беларусь, у Мінск.

З 1983 года па 1986 год Ф. Ф. Пісарук – начальнік Мінскага акруговага Дома афіцэраў. З 1986 года па 1990 год працаваў лектарам аддзела прапаганды і агітацыі палітупраўлення акругі.

Нейкі час Фёдар Фёдаравіч быў намеснікам дырэктарам Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларускай ССР (цяпер – Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага), потым працаваў у Мінскім тэатры юнага гледача (цяпер – Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача).

У 1986 годзе Ф. Ф. Пісаруку прысвоена званне «Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР».

Памёр Фёдар Фёдаравіч Пісарук 1 лістапада 2001 года.

# ПРЫМАЧУК ВАСІЛІЙ ІВАНАВІЧ
## майстар спорту СССР, суддзя рэспубліканскай катэгорыі па вольнай барацьбе, маёр ВС



Васілій Іванавіч Прымачук нарадзіўся 14 студзеня 1950 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў 4 класы пачатковай школы ў Мацах, потым вучыўся ў Стрыгаўскай сярэдняй школе, Гарадзецкай школе-інтэрнаце. У Брэсцкай школе-інтэрнаце, куды быў пераведзены пасля 8 класа, сур'ёзна заніма ўся спортам.

У 1968 годзе юнак паступіў у інстытут фізічнай культуры БССР (цяпер Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры).

У 1970 годзе дваццацігадовы спартсмен атрымаў званне майстра спорту СССР па вольнай барацьбе. Чэмпіён БССР сярод моладзі ў 1970 годзе, сярэбраны прызёр адкрытага першынства БССР (Гомель, 1970), удзельнік маладзёжнага першынства СССР па вольнай барацьбе (Казахстан, 1970). Быў суддзёй міжнародных турніраў па вольнай барацьбе на прызы трохразовага алімпійскага чэмпіёна А. В. Мядзведзя (1970, 1971).

Малады спартсмен неаднаразова станавіўся героем публікацый у газеце «Физкультурник Белоруссии» (1969, 1970, 1971) – рэспубліканскай спартыўнай газеце Беларусі. У 1971 годзе атрымаў кваліфікацыйную катэгорыю «суддзя Рэспубліканскай катэгорыі па вольнай барацьбе».

Службу ў Савецкай арміі Васілій Прымачук у званні лейтэнанта праходзіў на Украіне. Экстэрнам скончыў поўны курс Васількоўскага ваеннага авіяцыйна-тэхнічнага вучылішча па спецыяльнасці «эксплуатацыя самалётаў і рухавікоў».

На працягу 17 гадоў (1972-1989) Васілій Іванавіч працаваў у Васількоўскім ваенным авіяцыйна-тэхнічным вучылішчы выкладчыкам, старшым выкладчыкам па фізічнай культуры (пачынаючы з 1993 года вучылішча ўвайшло ў склад Кіеўскага інстытута ВПС). Працягваў прафесійна займацца спортам. Чэмпіён Кіеўскай вобласці і Кіеўскай ваеннай акругі.

У 1989 годзе служыў у Групе савецкіх войскаў, якая дыслакавалася ў ГДР. Займаў пасаду начальніка фізічнай падрыхтоўкі дывізіі. Пасля вываду савецкіх войскаў з краіны В. І. Прымачук вярнуўся ў Беларусь, на Кобрыншчыну. Працаваў у розных арганізацыях. Сёння на пенсіі.

Васілій Іванавіч жыве ў Кобрыне, але большую частку часу праводзіць у бацькоўскай хаце ў Мацах.

## ПРЫМАЧУК ВІКТАР ІВАНАВІЧ
## сапраўдны член (акадэмік) МАІТ у галіне інфармацыйных тэхналогій, заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі



Віктар Іванавіч Прымачук нарадзіўся 24 кастрычніка 1953 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў чатыры класы пачатковай школы ў в. Мацы, потым вучыўся ў Дзівінскай школе-інтэрнаце. Пасля заканчэння школы праходзіў тэрміновую службу ў Савецкай арміі. У 1974 годзе паступіў у Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут (цяпер Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт).

Пасля двух гадоў вучобы Віктар Прымачук паехаў на БАМ – Усесаюзную ўдарную камсамольскую будоўлю. Працоўную загартоўку атрымаў менавіта на будаўніцтве Байкала-Амурскай магістралі, дзе з 1978 года па 1984 год прайшоў шлях ад майстра да начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела будаўнічага падраздзялення. У 1980 годзе скончыў Брацкі індустрыяльны інстытут па спецыяльнасці «інжынер-будаўнік прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва». Узнагароджаны медалём «За строительство Байкало-Амурскай магистрали» (1984).

З 8 жніўня 1984 года па 18 снежня 1990 года В. І. Прымачук працаваў у Міністэрстве агульнага машынабудавання СССР намеснікам, начальнікам аддзела капітальнага будаўніцтва. Пасля ліквідацыі міністэрства працаваў выключна ў будаўнічай галіне, займаўся будаўніцтвам шэрагу буйных і ўнікальных аб’ектаў, у тым ліку Адзінага цэнтра дыспетчарскага кіравання ААТ «РЖД» у Хабараўску і вычышчальных збудаванняў поўнай біялагічнай ачысткі для ААТ «Воронеж-синтезкаучук».

З 2006 года – генеральны дырэктар ТАА «Строительно-монтажный поезд № 93» («СМП-93»), якое з 1990 года займалася будаўніцтвам аб'ектаў прамысловага і грамадзянскага прызначэння на будаўнічым рынку Масквы, Маскоўскай вобласці і іншых рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. З 1 чэрвеня 2009 года – генеральны дырэктар Далёкаўсходняй дырэкцыі «Росстроя», асноўнымі функцыямі якой з'яўлялася распрацоўка і ўзгадненне праектнай дакументацыі па забудове вострава Рускага, арганізацыі будаўнічых работ на аб'ектах саміту АТЭС.

Асноўныя навуковыя дасягненні: узвядзенне будынкаў і збудаванняў з маналітнага жалезабетону. У рамках дадзенага навуковага кірунку распрацавана канцэпцыя адаптыўнай тэхналогіі правядзення будаўнічых работ на аснове бетонных модуляў-канструкцый, стварэння інструмента тэхнічнай дыягностыкі па

кантролі нагрузачных характарыстык і параметраў, прапанаваны аналітычныя метады мадэліравання модульных збудаванняў. Распрацаваў тэорыю кладкі бетону ў аб'ёмна-перастаўной апалубцы пры ўзвядзенні вышынных будынкаў. Аўтар больш 30 навуковых прац, трох вынаходстваў.

У 2000 годзе В. І. Прымачуку прысвоены вучоныя ступені доктара філасофіі ў галіне інфармацыйных тэхналогій (эканоміка) і доктара навук у галіне інфармацыйных тэхналогій (эканоміка). З 2002 года Віктар Іванавіч з'яўляецца сапраўдным членам (акадэмікам) Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій (МАІТ).

